А зь якою вялікаю радасьцю і любоўю сустракалі Сьвяты Вечар нашыя бацькі, дзяды й прадзеды! Мейсца на покуці пад іконамі ў хаце было прадназначана для куці – як мейсца для Народжанага Хрыста Госпада. Калі-ж у часе вячэры зьяўляўся ў хату падарожны, то ўважалі, што яго Бог паслаў і садзілі яго на пачэсным месцы. Бо-ж Апостал сказаў, што некаторыя людзі гасьцілі ў сябе Ангелаў (Аўрам Бога й двух Ангелаў).

Сваім нараджэньнем Госпад наш Ісус Хрыстос прынёс на зямлю й Сьвятло для ўсіх, каб яно заўсёды зьяла й ніколі не заходзіла. Сьвятло гэтае запачаткавала новую эру ў гісторыі сьвету, ёсьць пачаткам перамогі жыцьця над сьмерцю, Сьвятла над цемраю, дабра над злом, праз што заўсёды прыгадвае нам, аб Сьвятле Хрыстовым, нашая Сьвятая Царква „бо й няма іншага імя пад небам, дадзенага людзям, якім бы нам спасьціся"(Дз. IV, 12).

З такімі нашымі думкамі, разважаньнямі й пажаданьнямі сардэчна вітаем Вас, Улюбёныя Браты й Сёстры з вялікім і радасным Сьвятам Нараджэньня Хрыста й Новым 1977 Годам!

Няхай незямныя праменьні Сонца-Праўды асьвецяць і абагрэюць душы Вашыя да жыцьця ў Хрысьце й з Хрыстом – бо „хто ў Хрысьце, той новае стварэньне" (2, Кар. 8–17) – каб мы й далей непахісна выконвалі запаветы Сьвятое Беларускае Праваслаўнае Аўтакефальнае Царквы нашых Сьвяціцеляў і мучанікаў.

Новы 1977 Год няхай паблагасловіць Госпад наш Ісус Хрыстос паўнатою шчасьця, якога мы ўсе так жадаем, а якое палягае на аднаўленьні духа і выкананьні Запаветаў Божых. Такога шчасьця мы Вам жадаем і просім Бога каб Яго ўсёдзеючае багаславенства дапамагло нам у нашай працы, для дабра нашае Сьв. БАПЦарквы й усяго нашага Беларускага Народу!

Каляды, лета Божага 1976.

З ЛАСКІ БОЖАЕ
Пакорны ў Богу Мітрапаліт Андрэй
Пакорны ў Богу Архіепіскап Мікалай

# 25 Гадоў Жыцьця Парафіі БАПЦ ў Клівэлэнд

Сьвяткаваньне адбылося дня 23–24 кастрычніка сёлета. Для ўшанаваньня гэтых двух юбілейных датаў, на ўрачыстасьць былі запрошаны: Уладыка Мікалай з Таронта, а. Грыгоры Кістнэр з Ню Ёрку, а. Максім Таўпека з Дэтройту й некаторыя ўкраінскія сьвятары.

Увечары 23 кастрычніка 1976 была адпраўлена Вячэрня, а ў нядзелю 24 кастрычніка а гадзіне 10 рана, Саборная Архірэйская Багаслужба ў саслужэньні: Мітрапаліта Андрэя, Архіепіскапа Мікалая, а. Грыгора, а. Максіма, й Малебен Удзячнасьці з удзелам Прат. а. Хведара Коваленко з Украінскае царквы Сьв. Троіцы.

Ужо ў суботу прыехала на ўрачыстасьць некалькі парафіянаў з Таронта й з Дэтройту. У нядзелю наведала Багаслужбу шмат украінцаў з суседняе украінскае царквы, а таму царква была так перапоўнена, што ўсе не маглі зьмясьціцца ў царкве, каб супольна ўзьнесьці малітвы да Госпада Бога й Апякункі парафіі Сьв. Жыровіцкае Божае Маці. Усе прысутныя былі ачараваны прыгожым сьпевам хору пад кіраўніцтвам Сп. Уладзімера Літвінка, а як ведама, прыгожы сьпеў выклікае й малітоўны настрой вернікаў.

Глыбока-зьмястоўную казань у ангельскай мове сказаў а. Грыгор, а Уладыка Андрэй азнаёміў прысутных з гістарычным фактам зацьверджаньня Наваградзкае Мітраполіі Усяленскім Канстантынопальскім Патрыярхам.

Пасьля Багаслужбы ўсе прысутныя былі запрошаны ў Царкоўную залю на супольны абед.

Кіраўніком на абедзе быў Уладыка Мікалай. Першым прывітаў прысутных сын Маёра Кліўленду, Ралф Пэрк, які прынёс ад маёра прывітальную грамату. 21 кастрычніка аб нашай урачыстасьці ў англамоўный прэсе, „Кліўленд Прэс", была зьмешчана карэспадэнцыя й фотаздымка царквы з настаяцелям і дыяканам.

Даклад аб заснаваньні й жыцьці парафіі на працягу 25 год, прачытаў праф. А. Каханоўскі.

Уладыка Андрэй прачытаў прывітаньні: ад Сакратара Кансысторыі БАПЦ Пратаярэя В. Кендыша, ад Прат. Карпа Стар настаяцеля парафіі ў Дароты, ад Прат. М. Мігая з Таронто, ад Інж. Міколы Гарошка Старшыні Парафіяльнае Рады прыходу Сьв. Кірылы Тураўскага ў Брукліне, і ад Сп. Аўгена Лысюка Старшыні Парафіяльнае Рады Парафіі ў Гайлэнд Парку.

Асабіста прамаўлялі: Прат. Хведар Коваленко й Мітрафорны Прат. Сьцяпан Ганкевіч, ад імя Парафіяў Украінскае Праваслаўнае Царквы ў Кліўлендзе, архітэктар А. Назарэць, аўтар праекту царквы, Др. Язэп Сажыц ад імя Парафіі ў Дэтройце, Сп. Антон Шукелайць ад Галоўнае Управы БАЗА, Сп. Кастусь Акула ад Клюбу *Пагоня*, Спадары Кірка й Телеш ад імя Парафіі ў Таронто, Ніна Амброзі,якая вельмі ўдала прадэклямавала свой верш у форме прывітаньня і, наапошку, а. Грыгоры Кістнэр прамаўляў ў ангельскай мове, якога авацыйна прысутныя віталі.




*Катэдральны Сабор Жыровіцкай Божай Маці БАПЦ ў Клівэлэнд, Огаё*

Закончылася афіцыйная частка малітваю *Дастойна Ёсьць*. Пасьля гэтага моладзь пад кіраўніцтвам Марыі Каваленка пратанцавала *Лявоніху* і *Крыжачок*. Жаночы ансамбль *Васількі* пад кіраўніцтвам Сп. Уладзімера Літвінка, прасьпеваў: *А ў полі вярба, Ручнікі...*, і *Ой і сеяла Ўльяніца лянок...*

ВЯСЁЛЫХ КАЛЯДАЎ
*ды*
Шчасьлівага Новага Году
*вельмі дастойным Уладыкам, Мітрапаліту Андрэю і Архіяпіскапу Мікалаю, Царкоўнаму Кліру, усім парафіянам і парафіянкам Сьвятое БАПЦарквы, жадае*
*ПАРАФІЯЛЬНАЯ РАДА ПРЫХОДУ СВ. КІРЫЛЫ ТУРАЎСКАГА*

# Помнік Усім Ведамым і Няведамым Беларусам Пастаўлены у Аўстраліі

Думка й гутаркі пра пабудову беларускага *Помніка* ў Мэльбурне распачаліся ад часу набыцьця беларускага магільніку. Ведама, гутаркі замала – патрэбны чыны. Ініцыятарам аказалася Сястрыцтва пры Парафіі БАПЦарквы, каторае й прыступіла да зьдзейсьненьня ўспомненага праекту, зразумела, у паразуменьні з Настаяцелям Парафіі й Парафіяльнай Рады. Сястрыцтва не паскупілася з працаю ані высілкамі. Справа паступова, але упэўнена, ідзе наперад. Палагоджана справа месца для Помніка, плян, падпісаныя кантракты з майстрамі ды сабіраюцца сьродкі для аплаты коштаў. Надыйшоў доўга чаканы дзень; 27 га лістапада 1976 г. Суродзічы Мэльбурна й ваколіц, вялікай грамадой сабраліся на нештодзённую ўрачыстасьць – *Пасьвячаньне Помніка*. Надвор'е на гэты дзень выпала, нібы з Ласкі Божае, цудоўнае – ціха, цёпла, утульна. Перад Помнікам, закрытым белым палатном, Настаяцель прат. Аляксандар, сказаў прачулыя словы на тэму ўрачыстасьці. Стаіць „Ганаровая Варта": дзьве сяστры ў нацыянальнай вопратцы, тры маленькія дзяўчынкі, гэтаксама апранутыя ў нацыянальныя касьцюмы, трымаюць вянок з жывых бела-чырвона-белых красак, ды бела-чырвонай істужкай – колеры Беларускага Нацыянальнага Сьцягу. Сястра Тамара, паангельску, прывітала суродзічаў і гасьцей, ды падзякавала за прысутнасьць у сяньняшняй нязвычайнай падзеі.

Перад помнікам стаяць тры сьвятары: Настаяцель памесная БАП Царквы, прат. а. Кулакоўскі, а. Чараламбос – Кіпрскае Прав. Цар. і а. Малоты Эгіпскае Прав. Цар. Чатыры прыслужнікі апранутыя у прыгожыя сьціхарыкі, стаялі са сьвечкамі й кадзілам. Настаяцель, прачытаў надасланае Блажэнейшым Мітрапалітам Андрэям Архіпастырскае Благаславенства. Сёстры (ганаровая варта) адкрылі Помнік. На чорнай мармуровай дошцы высечана й залатымі літарамі напісана: „НА ВЕЧНЫ ЎСПАМІН СПАЧЫЛЫХ УСІХ ВЕДАМЫХ І НЯВЕДАМЫХ БЕЛАРУСАЎ", з другога боку, прыгожа аздобленага Ефрасінеўскага Крыжа, гэта самае па ангельску. Пад крыжам, па нагельску напісана: „Ахвяраваны праз беларусаў у Вікторыі."

Пачалася жалобная служба й пасьвячэньне Помніка. Прысутныя ў маліто ўным настроі выслухалі малітвы ў Царкоўна-Славянскай, Грэцкай і Арабскай мовах. Багаслужбу упрыгожваў мілагучнымі-жалобнымі напевамі добра сасьпяваны ўзмоцнены Царкоўны Хор, пад кіраўніцтвам нашага маладога рэгента Сп. Аўгеня. Перад „Вечная Памяць" дзяўчаткі якія трымалі, з бел-чырвона-белых красак Вянок, паклалі яго на ПОМНІК і пакланіўшыся адступілі некалькі крокаў назад.

Па заканчэньні службы ўсе суродзічы й госьці былі запрошаны на супольны пачастунак, прыгатаваны сястрыцтвам у скаўтскай залі, паблізу магільніка. У залі чакалі вялікія, абрусамі засланыя, з запаленымі сьвечкамі ды перапоўненымі ўмела прыгатаванымі стравамі, сталы. За „пачэсны" стол засядаюць госьці: духавенства, дырэктар магільніку, прадстаўнік арганізацыі „Добра Суседзкіх Суадносін" (гуд нейбор каўнсіл), сакратар „экумэнічнай службы", дырэктар Аўстралійскай Рады Цэркваў, Брыгадзер Арміі Збаўленьня (Солвэйшон Армы), з сужонкамі. Настаяцель прадставіў гасьцей. Пабагаславіў стол. Прысутныя адсьпявалі „Ойча Наш", ды прыступілі да спажываньня страваў. З прамовамі выступілі: Дырэктар Магільніку, Дырэктар Аўстр. Рады Цэркваў і іншыя. Сястра Кацярына падала падарак Дырэктару Магільніка й сужонцы ад імя Сястрыцтва. На заканчэньне сястра Анна зачытала зьмястоўны ліст, асьвятляючы справу пабудовы Помніка ад пачатку аж да цяперашняга мамэнту. Падзякавала ўсім хто спрычыніўся да асягненьня мэты, ды заклікала ўсіх, а перадусім жанчын і моладзь, да далейшай дапамогі ў справах якія будуць добрым прыкладам для нас і нашага наступнага пакаленьня. З прыемнасьцю трэба зазначыць, што падчас пасьвечаньня Помніка й пачастунку прысутнічала шмат моладзі – гэта-ж і ёсьць нашае асягненьня і надзея.

*Помнік зроблены з чорнага й сівага граніту. Памер: 9 на 4 футы, вышыня 12 футаў. На Помніку надпісь:*

НА ВЕЧНЫ ЎСПАМІН СПАЧЫЛЫХ УСІХ ВЕДАМЫХ І НЯВЕДАМЫХ БЕЛАРУСАЎ

IN EVERLASTING MEMORY OF ALL KNOWN AND UNKNOWN BYELORUSSIANS

DEDICATED BY BYELORUSSIANS OF VICTORIA

# З НАШАГА ЖЫЦЬЦЯ

## Слуцкае Паўстаньне ў Нью Ёрку

У нядзелю, 5га сьнежня сёлета, у Царкоўна-Грамадзкім Цэнтры, на Атлантык Эвэню ў Нью Ёрку адбылося сьвяткаваньне Дня Беларускіх Гэрояў.

Пасьля ўрачыстай Божай Службы й Паніхіды па палеглых Гэроях а. Рыгор сказаў прыгожую пропаведзь прысьвечаную памяці загінуўшых.

А 2-ой гадзіне ў царкоўнай салі адбылася акадэмія. Прыгожы даклад на тэму ДНЯ ГЭРОЯЎ зрабіў Прафэсар Антон Адамовіч.

## Мастацкая Выстаўка ў Нью Ёрку

Стараньнямі Старшыні БІНІМ, Доктарам Вітаўтам Тумашам, была зарганізавана й 28-га лістапада г.г. адчынена выстаўка жывапісу, графікі й твораў царкоўнага мастацтва. Важна зацеміць што некулькі йконаў, напісаных вядомым беларускім майстрам Сп. М. Саўкам–Міхальскім, былі выканаxы не алеям, а старой тэхнікай – тэмпэрай.

## 14–я Сэсыя Рады БНР

У суботу 27-га лістапада сёлета, у будынках Пётры Крэчэўскага, адбылася 14-я Сэсыя Рады БНР. На Старшыню Рады быў перавыбрпны Др. В. Жук-Грышкевіч.

# Арганізацыя Парафіі ў Клівэлэндзе

*Працяг з 4-й бачынкі*

больш 2-х год, бо з кожным днём павялічваўся лік парафіянаў, а таму паўстала новая ідэя пабудаваць новую царкву на набытым пляцу.

Праект гэты на Агульным Сходзе 20-га красавіка 1958 г. быў прыняты. Даручана Парафіяльнай Радзе знайсьці архітэктара, зацьвердзіць плян і распачаць будову. Належыць тут адзначыць, што вялікую ролю пры афармленьні тэхнічнае і фізычнае працы належыць прызнаць Старшыні Рады Сп. М. Гумену і скарбніку Сп. М. Ягаўдзіку, якія маючы практыку з рэлігійнае працы ў Англіі з запалам далучыліся да будовы новае сьвятыні.

Чацьвертага ліпеня 1959 г. Настаяцель прат. М. Макарэвіч у саслужэньні прат. Калістрата, хору і рэгента Кіслага пасьвяціў кутавы камень пад будову царквы й будова пачалася.

Кіраваў будоваю архітэктар А. Назарэц, Парафіяльная Рада й будаўляны камітэт: Калоша, Стрэчань і Семенчук. Бальшыню працы парафіяне выканалі самі. Трэцяга верасьня 1960 г. Арх. Васіль у асысьце настаяцеля парафіі а. Яўхіма, а. М. Мацукевіча й пратадыякана Калістрата пасьвяціў царкву. Урачыстасьць пасьвячэньня адбылася ў часе „Сустрэчы Беларусаў", а таму прысутнічала шмат людзей з Амэрыкі й Канады. Царква ўнутры была яшчэ не закончана, а таму яшчэ на працягу некалькіх год праводзілася ўдасканаленьне: набываліся Іконы, інвэнтар, пазалочаньне рэчаў і ўсё новае неабходнае для Багаслужбы. Шмат рэчаў набыта дзякуючы ахвярнасьці вернікаў і арганізацыяў. Да найбольш ахвярных належаць: Сп. Ян Скабелін, які закупіў рэчаў на 12,567 даляраў, фірма Лук'ян Мэтал ахвяравала 2,500 даляраў, Жаночае Згуртаваньне – 2,600 дал., і Арганізацыя Моладзі – 1,159.95 дал.

Цяпер Царква зьяўляецца Катэдральным Саборам, а яе настаяцелям ёсьць Уладыка Андрэй што робіць для парафіі асабліва гонар. Вялікую ролю ў жыцьці парафіі меў і мае царкоўны хор, якім кіравалі здольныя рэгенты як М. Куліковіч, К. Кіслы, а цяпер У. Літвінко. Сёмага студзеня 1969 г., на запросіны мэра гораду, царкоўны хор сьпяваў калядныя песьні ў Сіты Гол.

Праца парафіі цячэ ціхім нармальным жыцьцём, як наш спакойны Нёман. Толькі часам, калі наляцяць злыя вятры, узбураць яго хвалямі, ускаламуцяць чыстую ваду, ён папеніцца, пашуміць, а калі муць асядзе на дно, зноў цячэ ціха. Але ў гэтай ціхай плыні штодзённага парафіяльнага жыцьця перахоўваецца багатае, зьместоўнае й глыбокае духоўна-грамадзкае жыцьцё з сваімі патрэбамі, праблемамі й радасьцямі.

У першую чаргу, гэта жыцьцё духоўнае, дзеля чаго й існуе царква. Адбываюцца рэгулярныя Багаслужбы, трэбы, а галоўнае навука ў казаньнях настаяцеля. Апрача гэтага: навука Закону Божага, Пастырска-Рэгенскія курсы якія існавалі ў 1961–63/64 гг., выдавецтва Бюлетэню, нотаў, сьвецкіх песень, перавыданьне „Гісторыі Новага Запавету", Калядныя і Вялікодныя прывітаньні для Япіскапаў і вернікаў ды арганізацыяў. Працавала суботняя школа пры парафіі ў 1962–1971 гг. у якой выкладалася 6 прадметаў. Было 4 клясы й вучыла 8 настаўнікаў. Адбываліся імпрэзы й рэфэраты.

Кожнага году ладзілася Калядная ялінка для дзяцей, банкет для царкоўнага хору, Парафіяльнае сьвята, Дзень Удзячнасьці, Дзень Маці, рэфэраты на рэлігійныя сьвяты як: Купальле, Юрыя, Каляды, Дажынкі, з гісторыі БАПЦарквы, ды іншыя. Амаль усе імпрэзы адбываліся з выступам сьпявачкі-дэкляматаркі Іры Сьмірноў-Каляды пад акампанімэнт У. Літвінка.

Парафія мела й мае сувязь зь іншымі парафіямі, урадавымі чыньнікамі й культурна-грамадзкімі інстытуцыямі. Найбольш цеснае су-

*Працяг на 8-й бачынцы*

# АЛЕКСАНДАР ЦЬВІКЕВІЧ

*А. Саковіч*

Менск. Дваццатыя гады. Гады вялікіх спадзяваньняў, гады ілюзіяў. Тады шмат хто паверыў, што ў Менску шырака разгарнула свае крыльлі адроджаная Беларусь, што Менск становіцца цэнтрам беларускае нацыянальнае працы. На сваю бяду паверыў гэтаму й др. Аляксандар Цьвікевіч. З свае волі ў 1926 годзе ён, разам з сваёй сям'ёю, вярнуўся з эміграцыі.

У тую пару я была студэнткаю Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту. Ад старэйшых ведала, якую выдатную ролю адыграў А. Цьвікевіч на Першым Усебеларускім Кангрэсе, будучы старшынёю рэзалюцыйнае камісіі, а пазьней ува Урадах БНР. Ведала пра ягоную дыпляматычную дзейнасьць, разам з С. Рак-Міхайлоўскім, на Мірнай канфэрэнцыі ў Берасьці, а таксама з праф. М. Доўнар-Запольскім у Кіеве – сталіцы Украінскай Народнай Рэспублікі (1918 г.). Ведала пра ягоныя працы з Гісторыі Беларусі й публікацыі. Аднаго ня ведала: пра палітычную памылку, якую ён дапусьціў на Бэрлінскай канфэрэнцыі 15-га кастрычніка 1925 г., падпісаўшыся пад „пастановаю" аб спыненьні дзейнасьці Ўраду БНР.

Менск спаткаў А. Цьвікевіча ветла. Яно й не магло быць інакай. У асяродзьдзі беларускае інтэлектуальнае эліты, да якой належыў А. Цьвікевіч і сярод якой меў блізкіх добрых сяброў (др. П. Трамповіч, праф. М. Доўнар-Запольскі, др. Я. Серада, Я. Купала, А. Смоліч, Я. Лёсік і шмат іншых) пераважаў настрой аптымістычны. Насьцярожанасьць, недавер, пакінутыя бальшавікамі пасьля галодных крывавых гадоў ваеннага камунізму нібы прытупіліся. Праўдзіва пачуцьці бальшыні беларускае грамады ў той час выказаў Я. Купала ў сваёй паэме „Безназоўнае":

*Нібы пчолы ў соты зь мёдам*
*Да свайго вульля,*
*Мы вяртаемся дадому,*
*Як адна сям'я.*

*На сход сходзімся і лічым,*
*Ці усе прыйшлі,*
*Хто спазьніўся – прыйсьці клічам*
*Да сваёй зямлі.*

У першы-ж год па звароце з Эміграцыі А. Цьвікевіч выявіў усю сілу сваіх здольнасьцяў і таленту. Галоўным чынам у Інстытуце Беларускае Культуры канцэнтравалася ягоная навукова-грамадзкая праца. Ужо ў 1926 годзе Навуковая Рада Інбелкульту выбрала яго навуковым сакратаром Інстытуту. У лістападзе таго самага году, на Акадэмічнай канфэрэнцыі па рэформе беларускага правапісу й азбукі, у ганаровы прэзыдыюм ад Інбелкульту ўваходзіў А. Цьвікевіч. Ён-жа вітаў канфэрэнцыю ад імя Беларускага Таварыства Культурнае Сувязі з заграніцаю. Хутка ягоныя гістарычныя дасьледаваньні пачалі публікавацца ў час. *Полымя.* Такія працы, як „"Западно-русская школа" і яе прадстаўнікі", „Характарыстыка становішча Беларусі ў 80–90 гг.", мелі глыбокі арыгінальны зьмест і чыталіся зь вялікай цікавасьцю. Зь нязменшай цікавасьцю слухаліся й ягоныя навуковыя даклады ў Інбелкульце, а ад 1929 году – у Беларускай Акадэміі Навук.

Я пазнаёмілася з А. Цьвікевічам і ягонай жонкаю хутка пасьля іхнага прыезду ў Менск. Потым бачыла іх зрэдку ў доме маёй старэйшай сястры, у тэатры ці на канцэртах. Але бліжэй пазнала ўсю іхную сям'ю ўлетку 1929 году, калі Цьвікевічы й мае сваякі, Грамыкі, нанялі пад Менскам у суседзтве дачы. Тады на дачы спаткалася я з Л. Зайцам і У. Пракулевічам, якія вярнуліся з эміграцыі разам з А. Цьвікевічам.

Ня памятую, як звалася месца, дзе былі дачы, але рэдкае харство краявіду й сёньня стаіць жывым у вачох. Бачу чатыры хутары, раскінутыя недалёка адзін ад аднаго на зялёным узгор'і. Ніжэй – зялёны поплаў і вузкую з чыстай празрыстай вадою рэчку, а за ёю раскошны хваёвы лес. На вышэйшай частцы узгор'я стаяла хата, у якой жыў Лявон Заяц зь сям'ёю. Крыху ніжэй і бліжэй да рэчкі дачу мелі Грамыкі, а праз масток ад іх, на другім беразе рэчкі, жылі сем'і Лойкаў і Цьвікевічаў. У іх хата была вялікая, стаяла ў садзе й мела тэрасу. На гэтай тэрасе Цьвікевічавы дзеці ладзілі хатнія спэктаклі й паказы. На адным із спэктакляў, дзесь у чэрвені месяцы, прысутнічала я. Былі на ім і У. Пракулевіч з жонкаю, якія ў тым часе гасьцілі ў Зайцаў.

Таго лета я блізка два месяцы падарожнічала па Каўказу. Вярнулася ў Менск у другой палове жніўня Разам із сваёй сярэдняй сястрой, Валянтынай, надумаліся мы зьезьдзіць на дачу Грамыкаў. Спалучэньне дачы з горадам было ня зь лепшых: частку дарогі трэба было ехаць аўтобусам, а частку йсьці пехатою праз лес.

Прыйшлі мы на аўтобусную стаянку а гадзіне 4-ій папаўдні. Там спаткалі А. Цьвікевіча й Міхася Лойку. М. Лойка ў той час быў дырэктарам рабфаку пры Беларускім Дзяржаўным Унівэрсытэце, а я на рабфаку працавала кансультанткай у габінэце мовы й літаратуры.

Жадаючых ехаць сабраўся добры натоўп людзей. Аўтобус адзін. Толькі ён падкаціў, цёткі й дзядзькі з торбамі, кошыкамі, куфрамі кінуліся да ягоных дзьвярэй. Спаборнічаць зь імі ніхто з нас не адважыўся. Мы праціснуліся ў аўтобус апошнімі. Ніводнага вольнага месца, не засталося. Давялося стаяць. Мы зь сястрою ня везьлі рэчаў з сабою, але мужчыны мелі пакункі й валізы. Яны паставілі валізы збоку ў праходзе. Прапанавалі мне й сястры сесьці на іх. Самі засталіся стаяць з пакункамі ў руках. Дарога была бітая. Нас моцна трэсла й падкідала. Каб мужчынам зручней было трымацца стоячы, мы пабралі іхныя пакункі сабе на калены. У вадным пакунку, што вёз А. Цьвікевіч, сьвяціліся раньнія духмяныя ігрушы. Я пазайздросьціла яму. Шчыра шкадавала, што не падумала купіць сваім малым пляменьнікам, а вязу толькі цукеркі. А. Цьвікевіч казаў, што ўбачыў гэтыя ігрушы ў апошнюю хвіліну ў прыватнай крамцы, калі сьпяшаўся на аўтобус. Запакаваць іх як сьлед у дарогу ўжо не пасьпеў.

У аўтобусе душыла гарачыня. Мне хацелася піць. М. Лойка жартаваў, што ён ніколі не даверыў-бы мне ігрушаў, а А. Цьвікевіч ветліва прапанаваў зьесьці ігрушу, каб прагнаць смагу. Я падзякавала, але адмовілася. Калі выйшлі з аўтабуса, мы былі радыя пасьля млоснае задухі на поўныя грудзі ўдыхаць чыстае лясное паветра. Сонца ўжо стаяла нізка над лесам. Ад яго ружавелі белыя хмаркі й сіняе неба.

– Заўтра будзе вецер, – глянуўшы на захад, сказаў А. Цьвікевіч, – добрае надвор'е для запуска зьмея ў неба.

На мужчынаў чакаў гаспадар іхнае дачы з канём. Яны паклалі свае валізы й пакункі на воз. Прапанавалі й нам зь сястрою сесьці ехаць. Але прыемней здавалася прайсьціся на пяхоту, чымся трэсьціся ізноў, як у аўтобусе. Да таго-ж конь выглядаў старым, ледзь цягнуў воз і без седакоў.

Я пайшла побач з А. Цьвікевічам. Пахвалілася яму, што люблю хадзіць: гэтым летам вандравала па Каўказу, а прошлым – з археалягічнай экспэдыцыяй па Гомельшчыне, Магілёўшчыне й Аршаншчыне. Каўказам А. Цьвікевіч не зацікавіўся, а пра экспэдыцыю распытваў. Пытаўся ў мяне пра нашых гісторыкаў, якія таксама бралі ўдзел у экспэдыцыі. Выказаў жаль, што мы, гадунцы савецкіх школаў, недастаткова ведаем лацінскую мову. Ён уважаў, што для гісторыкаў яна неабходная.

Мы яшчэ сядзелі з Грамыкамі на тэрасе за вячэраю, калі А. Цьвікевіч з сваімі дзецьмі й старэйшым Лойкавым хлапчуком прайшлі міма нас. Яны несьлі кошыкі й сухое гальлё. Зьбіраліся з-пад карчоў у рацэ на агонь лавіць ракаў. Швагар пажартаваў, каб ня мінулі нас, калі будуць ісьці назад, падзяліліся ўловам. Штось ня было чутно пазьней пра багаты ўлоў. Затое помніцца радасны гоман дзяцей і вогнішча ў цемені начы над рэчкаю.

Таго вечару мы з Грамыкамі пайшлі прайсьціся праз масток. Завіталі на тэрасу да Цьвікевічаў. Там былі й Лойкі. Жонка А. Цьвікевіча, Зіна, скардзілася, што ігрушы не давезьліся да дачы, падобна, параскідаліся з пакунка ці вываліліся з воза на дарогу. А. Лойка запэўняў яе, што ў аўтобусе мяне мучыла смага, і гэта я, карыстаючыся спагадаю А. Цьвікевіча, паела ўсе ігрушы. Пасьля лоўлі ракаў прыйшоў на тэрасу пасядзець разам з усімі А. Цьвікевіч. І ён не запярэчыў М. Лойку. Я прабавала бараніцца, а ўсе толькі рагаталі.

На дачы нярэдка можна было бачыць Л. Зайца з вудаю над рэчкай, М. Грамыку – з сшыткам і алавіком пад хвояй у лесе, А. Цьвікевіча – зь дзецьмі. А. Цьвікевіч заўсёды ўмеў штось цікавае зрабіць для іх. Так, на другі дзень ён зьмайстраваў вялікага белага зьмея. Глядзець, як будзе лётаць зьмей, на лузе сабраліся ўсе малыя й некаторыя з дарослых.

Дзень выдаўся надзвычайны. Навокала ўсё зіхацела ў сонцы. Дзьмуў сьвежы ветрык. А. Цьвікевіч, высокі, зграбны, стаяў у цэнтры сярод дзяцей. Ягоныя кароткa падстрыжаныя чорныя валасы на ілбу раскідаў вецер. Ён тлумачыў старэйшым хлапчукам, як трэба запускаць зьмея, а тады прадэманстраваў ім. Пабег. Беглі побач яго, задраўшы ўгору галовы, хлапчукі; а зьмей з даўгім хвастом узьнімаўся вышэй і вышэй, пакуль не зрабіўся зусім маленькім, нібы белы птах у сінім

*Працяг на 8-й бачынцы*

# НОВЫ АГАСВЭР

В. Вальтэр

*Ідзі!.. і ты ідзеш жыцьцю усяму адданы,*
*Ідзі!.. ты чуеш нейкі голас у імгле.*
*І ты ідзеш... хай сэрца поўняць раны,–*
*Хай кроў твая на змучаным чале...*
*Ты усё ідзеш... меняюцца так годы,*
*Дарогі новыя звіваюцца змяёй,–*
*Мігаюць вёскі, месты і народы,*
*І камені ляцяць з гары тваёй!*
*А ты ідзеш... твой шлях, як Агрaсвэра,*
*Блукаць па съвету з сумам у грудзёх,–*
*Ідзі... ідзі!.. німа пакуце меры,*
*Німа, німа канцоў тваіх дарог!..*
*І ты ідзеш... ты новы сымвал веры*
*Ствараеш з слёз, з разбітых старых вер,–*
*Ідзеш далей, ідзеш у шуканьнях веры,*
*Ты – эмігрант, – ты – вечны Агасвэр.*

В. Вальтэр, аўтар вершу *Новы Арасвэр*, паходзіў зь Дзьвіншчыны. Вышэйшую асьвету здабыў у Празе Чэскай (1921–1925) на факультэце будаўніцтва. Выдатны матэматык. В. Вальтэра найбольш цікавілі дакладныя навукі. Апрача гэтага ён меў шырокія веды з галіны грамадазнаўства, метафізыкі й палітыкі. Пісаў. Яшчэ будучы студэнтам палітэхнікі Вальтэр прыгатаваў да друку зборнік вершаў, але выдаць друкам сваю працу ў Празе Чэскай яму не ўдалося з прычыны сур'ёзнай хваробы лёгкіх (сухотаў).

Ягоныя вершы друкаваліся на балонках беларускай пэрыядычнай прэсы. *Новы Агасвэр* Пётра Крэчыўскі зьмясьціў у сваім зборніку „Замежная Беларусь" (Кніга Першая 1926 г.).

Сюжэт вершу: Легендарны „Вечны Жыд", які на пачатку Новай Эры згубіў сваю Бацькаўшчыну, ды змушаны блукаць па цэлым сьвеце. Аўтар *Новага Агасвэра* параўноўвае лёс беларускага эмігранта да лёсу *Новага Агасвэра.*

Зьвяртаючыся да беларускага эмігранта В. Вальтэр кажа: „Твой шлях як Агасвэра", блукаць па сьвеце ў пошуках лепшай долі для свайго народу. В. Вальтэр верыць, што беларускі народ будзе цярпець так доўга й так моцна, пакуль ня знойдзе самога сябе. Толькі вялікая сіла веры, веры ў свае собскія сілы вызваліць беларускі народ зь няволі.

*В. Вальтэр*

*М. Харошка*

# Александар Цьвікевіч

*Працяг з 7-й бачынкі*

небе. Пасьля бацькі вучыўся запускаць зьмея дзесяцігадовы сын, Віктар.

У Цьвікевічаў было чатырох дзяцей: Тацяна, Віктар, Вадзім і прыяцелька маіх малых пляменьніц Мума (Марыя). Вадзім, вельмі падобны да свайго бацькі, маладзейшы ад Віктара на год-паўтара, у 1928 г. памёр ад маланкавай шкарлятыны. Цьвікевічы цяжка перажывалі гэтую сьмерць. Улетку 1930 г. на іхную сям'ю зваліліся новая трагэдыя: арышт А. Цьвікевіча.

Аднойчы жонка А. Цьвікевіча расказала нам пра ноч вобыску й арышта. Яны, як і большасьць іншых беларусаў, былі падрыхтаваныя, што арышт іх ня міне. Чакалі яго з дня на дзень. Калі да іх прыйшлі афіцэры ГПУ, яны разбудзілі дзяцей. Разам з дзецьмі селі на канапу. Наглядалі моўчкі, як у шуфлядах пісьмовага стала рыліся два агэнты. Праз рашчыненыя дзьверы ў спальню відаць быў трэці: ён ператрасаў пасьцелі на ложках. Ніхто не размаўляў. Панавала напружаная цішa. Толькі час ад часу шорхалася аб падлогу адкінутая ўбок папера ці кніжка. І раптам А. Цьвікевіч сказаў сыну:

– Глядзі, Віктар, і памятай. Усё жыцьцё памятай.

Сказаў голасна, выразна й рукою паказаў на агэнтаў. Тыя ў зьдзіўленьні ўзьнялі галовы.

Тады за кратамі ГПУ апынулася шмат лепшых розумаў навуковае й грамадзкае Беларусі, таксама – лепшае моладзі. Дзень-у-дзень афіцыйная прэса асуджала, пагражала й старалася пераканаць, што зьняволеныя беларусы – „злосныя шкоднікі" й заслугоўваюць на вышэйшую меру пакараньня – расстрэл.

Былі гэтыя абвінавачваньні рэальнымі?

Год перад тым амаль дакладна тыя-ж самыя абвінавачваньні сыпаліся на галовы ўкраінцаў. І там адбыўся працэс пад назваю „Саюз Вызваленьня Украіны". Мы чыталі шмат пра „ўкраінскіх шкоднікаў", „шпіёнаў" якія „зрадзілі свайму народу", „за грошы прадавалі родную краіну"... Чыталі й ня верылі. У кожным разе ў Менску сярод тых, каго я ведала, ніхто ня верыў. І цяпер ніхто ні на хвіліну не дапушчаў думкі, што нашыя арыштаваныя маглі зрадзіць свайму народу.

На зьмену лета й восені, поўных эмацыянальнай напружанасьці й трывогі, прыйшла зіма. Сьнег пакрыў горад. На Сьвіслачы цяжкім пластом лёг лёд. Дні сталі кароткімі, ночы даўгімі. У цішы ночы страшнейшымі, чымся ўдзень, здаваліся фантастычныя абвінавачваньні... гублялася надзея. Нямала пралілі сьлёзаў у тыя ночы жонкі зьняволеных.

Аднойчы ў пакоі ГПУ, адкуль прымалі перадачы для арыштаваных, я спаткала З. Цьвікевіч. Ейную перадачу ня прынялі. Выкінулі назад з вакенца кошык з харчамі ды яшчэ й насварыліся, каб не замінала ім з пытаньнямі, а хутчэй звольніла месца ля вакенца. Яна заплакала й адыйшла. Іншыя кабеты пачалі яе суцяшаць, хоць і ў іх саміх на тварах адбівалася ня меншае хваляваньне, чымся ў З. Цьвікевіч. Кожная з іх ведала, што заўтра могуць ня ўзяць перадачы й у яе.

Таго дня я з З. Цьвікевіч разам ішла частку дарогі дадому. Яна болей ня плакала. Ішла па вуліцы, як заўсёды, прыгожая, спакойная, з высока ўзьнятай галавой. Казала:

– Мне сорамна, што нэрвы ня вытрымалі. Гэта-ж толькі пацеха для ГПУ. Жонка ў сьлязах – яны могуць гэта выкарыстаць... Я не павінна была плакаць перад імі. І ніколі не заплачу.

І гэта было праўдай. Некалькі разоў пасьля таго, шмат часьцей як у іншых, у яе ня бралі перадачы для мужа. Але ніколі болей яна не заплакала перад службоўцамі ГПУ. Ейныя ясныя блакітныя вочы заставаліся сухімі, зімнымі.

У асяродзьдзі сем'яў арыштаваных ня раз задумваліся, чаму так блага абыходзяцца з жонкаю А. Цьвікевіча, ня прымаюць для яго ні запісак, ні перадачаў. Адказ на гэта мы атрымалі шмат пазьней, калі блізкія нам людзі апынуліся паза сьценамі ГПУ, на выгнаньні.

ГПУ прабавала змусіць А. Цьвікевіча згадзіцца на ролю кіраўніка няіснуючай арганізацыі „Саюз Вызваленьня Беларусі". Наткнулася на цьвёрды супраціў. Паводля расказаў ягоных сяброў, ён ня толькі бараніўся, ён дыскутаваў зь сьледчымі: „Калі я згаджуся з вамі, узьвяду паклёп на сябе й на сваіх сяброў, каму гэта дапаможа? Беларусам? Я – беларус, я– нацыяналіст, я ніколі ні перад кім не хаваўся з гэтым. Павінен я прызнаць сябе вінаватым у тым, што люблю свой край, свой народ? Зганіць, згадзіцца назваць шкодным усё тое, што мы рабілі, што робіць у сябе й да чаго імкнецца кожны цывілізаваны народ у сьвеце?.."

У момант крызысу А. Цьвікевіч выявіў сябе чалавекам моцным, непахісным. І тое, што ў Беларусі ГПУ ня здолела падрыхтаваць судовага працэсу „Саюз Вызваленьня Беларусі", вялікая заслуга й А. Цьвікевіча.

# Клівэлэнд

## АРГАНІЗАЦЫЯ Й ДЗЕЙНАСЬЦЬ ПАРАФІІ

*Працяг з 6-й бачынкі*

працоўніцтва існуе з Украінскаю й Сэрбскаю Цэрквамі.

Вялікі гонар быў зроблены нашай царкве 18-га ліпеня 1968 г., калі наш настаяцель, Уладыка Андрэй, быў запрошаны прачытаць малітву на агульна-нацыянальным мітынгу Паняволеных Народаў на „Паблік Сквэр".

Амаль кожны год заклікаюцца рэпартэры, робіцца фота царквы,й падаюцца абвесткі ў англамоўную прэсу пра сьвяточныя Багаслужбы й імпрэзы.

У гэтым рэпартэжы німа магчымасьці намаляваць поўны абраз 25-ці гадовага жыцьця парафіі, аднак трэба зазначыць, што ў гэтым шматбаковым жыцьці бралі ўдзел, больш менш, раней ці пазьней, блізу ўсе парафіяне.

Мінула 25 год!

За гэты час мы прайшлі дарогу ад невялікай парафіі, у чужым будынку да ўласнае, хоць і невялікае, але прыгожае Мітрапалічае Катэдры, якая сталася важнейшым рэлігійным і нацыянальна-грамадзкім асяродкам гуртаваньня Беларусаў у Клівэлендзе.

Жыцьцё не стаіць на мейсцы. Яно йдзе наперад па шляху, які дыктуе нам Бог. Што чакае парафію заўтра? Прадказаць гэта й прадбачыць мы ня можам. Мы можам толькі верыць у лепшае, верыць, што нашая царква й надалей будзе жыць і разьвівацца.

Зарука гэтаму – найперш наш настаяцель, Уладыка Андрэй. Не зважаючы ўвагі на свой век і стан здароўя, на абавязкі галавы царквы, ён дзейны й руплівы – знаходзіць сілы й час на духоўнае акармленьне парафіі, на кантакты зь сьвятарамі іншых цэркваў, на адведзіны хворых парафіянаў у шпіталях і розныя іншыя справы.

Зарукаю гэтаму – і самі парафіяне. Іхняя рэдкая ахвярнасьць, як грашовая, так і ў працы. Хоць паасобныя сябры гэтай жывой і дружнай сям'і з рознымі поглядамі, характарамі, з рознай ацэнай запраўднасьці, выказваюць часам нібыта супярэчныя думкі, але для агульнага дабра парафіі заўсёды верх бярэ добразычлівасьць, разважнасьць, шчодрасьць, а таму ўсялякія перашкоды перамагаюцца.

Як ужо была выказана паралель жыцьця парафіі да нашага Беларускага Нёману: дык няхай-жа Нёман нясе й далей сваю чыстую ярданскую ваду ў мора гісторыі Беларускае Аўтакефальнае Праваслаўнае Царквы.

*Зьмест гэтага артыкулу ўзяты, ў скарочаньні, з рэфэрату Сп. Праф. Аўгеня Каханоўскага, які ён прачытаў 24 кастрычніка, ў дзень сьвяткаваньня 25-ых угодкаў ад заснаваньня Парафіі Жыровіцкай Божай Маці ў Клівэлендзе.*

*Рэдакцыя*



## ЗАПРОСІНЫ

*У нядзелю, 9-га студзеня 1977-га г. Парафія Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы ў Брукліне ладзіць вялікі Калядны абед на які ветліва запрашае ўсіх парафіянаў, іхніх знаёмых ды ўсіх беларусаў Вялікага Ню Ёрку.*

*Урачыстая Божая Служба пачнецца, а гадзіне 10-ай раніцы ў Катэдральным Саборы й будзе ачолена Прот. Васілём Кэндышам ў саслужэньні а. Рыгора Кістнэра, новага сьвятара нашай Парафіі.*

Прат. Васіль Кэндыш, Настаяцель Парафіі
Айцец Рыгор Кістнэр
Парафіяльная Рада

THE ANGLO–BYELORUSSIAN SOCIETY
Presents

**LECTURE COURSE ON BYELORUSSIAN CULTURE**

The eleventh annual course of lectures on Byelorussian history, literature and art has been organized by the Society for the 1976–1977 academic year. The course is open to all members of the public. Lectures will be held on Thursday evenings at The Francis Skaryna Byelorussian Library, 37 Holden Road, London, N.12. The program includes:

**January 27** – 'Aspects of Byelorussian paleography' Rev. A. Nadson *(Francis Skaryna Byelorussian Library)*

**February 24** – 'Byelorussian influences on Russian 17th century architecture'. Dr. Lindsey Hughes *(University of Reading)*

**April 21** – 'Byelorussian orthography in the 20th century'. Peter Mayo *(University of Sheffield)*

**May 19** – 'Language policy in Soviet Byelorussia'. James Dingley *(University of Reading)*

**June 16** – 'Polack-land in the 16th century'. Dr. Richard A. French *(University College)*

Hon. John Jolliffe, Chairman